ПОМНІК ДЛЯ КЛАСІКА

Паміж аптэкай і сельсаветам

Па адукацыі ён гісторык, але працуе барменам у Мінску. Вольны час прысвячае розным карысным справам. Напрыклад, даведаўся, што землякоў вельмі хвалюе адсутнасць у Глушы музея Алеся Адамовіча. Вось ён і вырашыў зрабіць унёсак у гэтую справу і сабраць грошы на помнік пісьменніку. Пакуль шукаў варыянты, стварыў з сябрамі ў Бабруйску ініцыятыўную групу, якая займаецца папулярызацыяй імя Алеся Адамовіча. У падтрымку сваёй ініцыятывы з помнікам сабраў больш за 600 подпісаў. За праект выказаліся жыхары Мінска, Магілёва, Бабруйска, Глушы. Пасля таго як ініцыятыву ўзгаднілі ў Міністэрстве культуры, аблвыканкаме і райвыканкаме, актывіст знайшоў скульптараў, якія пагадзіліся за адносна невялікую суму зрабіць бронзавы бюст. Паменшаная яго версія ўжо існуе. Андрусь спадзяецца, што да дня нараджэння пісьменніка — 3 верасня — помнік будзе зроблены ў натуральную велічыню. Звароты падтрымаць добрую справу ён размясціў у розных сацсетках і на платформе «Талака». На працягу месяца атрымалася сабраць у эквіваленце 3300 долараў.

Месца для помніка яшчэ трэба ўзгадніць з райвыканкамам. Але сам Андрусь, і яго падтрымлівае ў гэтым дачка пісьменніка — Наталля Адамовіч, бачыць толькі адзін варыянт. Бюст павінен знаходзіцца паміж будынкам аптэкі і існуючым Глушанскім сельвыканкамам. Пакуль гэта, па звестках сельвыканкама, пустуючая пляцоўка, і калі яна будзе задзейнічана, там, акрамя помніка, паявіцца яшчэ і прыгожы «літаратурны» сквер.

Нулявы кіламетр

Па дарозе ў Глушу Андрусь агучвае яшчэ адну не менш цікавую ідэю — стварыць тут прыпынак у гонар Адамовіча. У Бабруйскім райвыканкаме яе падтрымалі. На сайце нават ёсць інфармацыя, што конкурс праектаў праводзіўся на працягу мая. Хутка будуць падведзены яго вынікі.

— Паступіла шмат цікавых прапаноў, але некаторыя з іх паўтараюцца, — кажа Андрусь. — Найболей прывабная — пазначыць гэта месца як нулявы кіламетр. І стрэлкамі паказаць звязаныя з Адамовічам мясціны: будынак аптэкі, помнік, вуліцу, месца пахавання.

Пакуль прыпынак носіць нейтральную назву «Глуша». Але, калі задумка рэалізуецца, ён стане добрым арыенцірам для турыстаў. Цікавая прапанова наконт афармлення прыпынку ёсць і ў старшыні Глушанскага сельсавета Марыі Сушчанкі. Яна лічыць, што цікавасці аб'екту мог бы дадаць інтэрактыўны варыянт. Сонечныя батарэі, антывандальны дысплэй, сістэма відэаназірання — цяпер такія ІТ-прыпынкі атрымалі распаўсюджанне дзякуючы беларускім распрацоўшчыкам. У Глушы такі прыпынак змог бы знаёміць турыстаў з фактамі з жыцця і творчасці Алеся Адамовіча. І цікава, і карысна. Бо гэта адначасова і развіццё альтэрнатыўных крыніц святла, і экалагічны складальнік, і прывіццё любові да сваёй малой радзімы, і папулярызацыя творчасці айчынных класікаў. Тым больш за пасляваенны час падзеі даўно мінулых дзён сталі забывацца і нават глушанская моладзь не заўсёды ведае, хто такі Адамовіч і што ён жыў у гэтым населеным пункце.

Паступова дойдзем і да музея.

Галоўнае — дзейнічаць

Андрусь літаральна фантануе ідэямі. Расказвае, што нават паспрабаваў сябе ў ролі арганізатара экскурсіі ў Глушу. Праз сацыяльныя сеткі знайшоў сярод бабруйчан тых, хто жадаў туды з'ездзіць, каб прайсціся па мясцінах, звязаных з Адамовічам. На жаль, у маршрутцы змаглі змясціцца толькі 20 чалавек, але ахвотных было нашмат болей, запэўнівае малады чалавек. Падарожжа пачалося менавіта з прыпынку, які можа стаць «адамовіцкім», потым прайшліся па вуліцы Адамовіча. Ёсць такая ў Глушы. Першапачаткова планавалася назваць імем пісьменніка цэнтральную вуліцу, дзе знаходзіцца будынак аптэкі. Але ў выніку спыніліся на той, па якой глушанскія дзеці бягуць у школу. У ёй падчас сваіх прыездаў на дарагую радзіму не раз бываў Алесь Адамовіч. Потым наведалі могілкі, што на ўскрайку сяла Дойнічава, — там, дзе знаходзяць свой апошні прытулак жыхары Глушы, быў пахаваны і Алесь Адамовіч побач са сваімі бацькамі, бабуляй, братам. На жаль, пабываць у музеі яшчэ невядома калі прыйдзецца. Не хапае грошай. Але Андруся гэта не бянтэжыць. Яго прынцып: трэба рабіць нягледзячы ні на што. І які там будзе вынік, яго не турбуе, галоўнае — паказаць, што ёсць такая справа, прыцягнуць увагу як мага большай колькасці людзей. Нядаўна вось паслаў ліст Івану Урганту, знакамітая бабуля якога — Ніна Ургант — сыграла ў фільмах «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой» Ганну Міхайлаўну Карзун — прататыпа маці Алеся Адамовіча. Зараз Андрусь мае намер выйсці на знакамітага брытанскага рэжысёра Дэні Бойла. Неяк прачытаў інтэрв'ю з ім, дзе той прызнаўся, што выбраць прафесію яго натхніў менавіта фільм «Ідзі і глядзі», зняты па творах Алеся Адамовіча. Магчыма, ён таксама не адмовіцца падтрымаць праект з адкрыццём музея.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Разліковы рахунак існуе пры **аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама р/с BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Двойчы юбілейны выпуск

Выпускнік Вадзім ЦЯПКО і Хрысціна АРАНОЎСКАЯ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да ўрачыстага пастраення і святочнага вальса застаецца літаральна паўгадзіны, але мы паспяваем пагутарыць з выпускнікамі-суворавуцамі. Так, старшы віцэ-сержант Андрэй Сазановіч скончыў вучылішча з залатым медалём.

— Усё пачалося ў 2013 годзе, калі я прыняў рашэнне паступаць сюды. У сям'і вайскоўцаў няма. Але з дзяцінства была мара стаць ваенным. Вучылішча — гэта добрая школа жыцця і афіцэрскіх кадраў. І за 5 гадоў ні разу не пашкадаваў, што вучыўся тут. Мяне падтрымлівалі бацькі, сябры і, канешне ж, афіцэры — не толькі па вучобе, але і ў жыццёвых сітуацыях. Свой прафесійны шлях я выбраў — паступіў на ваенны факультэт БДМУ.

— Суворавускае вучылішча дае пэўную загартоўку ў жыцці, — кажа **старшы віцэ-сержант Даніла ПЕТУХОЎ**. — Даведаўся шмат чаго аб вайсковай тэхніцы, узбраенні, знайшоў новых сяброў. І паглядзеў на парады вачыма ўдзельніка. Я праходзіў у іх двойчы — у 2016 і 2017 гадах, абодва разы на Дзень Незалежнасці. Парады запомніліся не толькі ўражаннямі, але і пяцімесячнай падрыхтоўкай да іх. Зараз жа паступаю ў Ваенную акадэмію. Мару стаць лётчыкам — з дзяцінства цягне ў неба...

У суворавускае вучылішча сёлета — зрэшты, як і заўжды, — прыйдуць паступаць 12-гадовыя хлопчыкі. Што і казаць, у такім узросце даволі складана вызначыць свой шлях на ўсё наступнае жыццё. Але...

— Ваенна-патрыятычнае выхаванне, прафілактычная і прафарыентацыйная работа з суворавуцамі, іх пастаянныя выезды ў злучэнні і воінскія часці, зносіны з афіцэрскім складам розных сілавых структур у канчатковым выніку дазволяць ім зрабіць усвядомлены выбар сваёй будучай прафесіі, — гаворыць **начальнік Мінскага суворавускага ваеннага вучылішча Аляксандр НАВУМЕНКА**. — Больш за 95 працэнтаў выпускнікоў ідуць у сілавыя структуры.

Усяго ж атэстаты атрымалі 62 выхаванцы, 15 з іх — са спецыялізаванага спартыўнага класа. Узвод выпускной роты падрыхтаваў чатырох кандыдатаў у майстры спорту, пераможцаў і прызёраў чэмпіянатаў краіны.

Міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ зазначыў, што выпускнікі суворавускага вучылішча атрымліваюць трывалыя веды.

— Хлопчыкі за гэтыя пяць гадоў пасталелі, памужнелі, атрымалі выдатную адукацыю і гатовыя ўступаць у дарослае жыццё. Калі вы паступалі ў 2013 годзе, то гэта быў час 60-годдзя вучылішча. А выпускаецеся ў год, калі вучылішча святкуе 65-годдзе. Не ўсім суворавуцам так пашанцавала...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ПРАЦЯГНУЦЬ РУКУ ДАПАМОГІ

Беларусь ужо другі раз за апошні год адправіла ва Украіну гуманітарную дапамогу.

Цяпер быў сабраны набор вырабаў на агульную суму каля 160,5 тысячы рублёў. Аснову склалі прадукты харчавання — мясныя кансервы, цукар, дрожджы, рапсавы алей, пшанічная мука, грэцкія крупы, макаронныя вырабы.

Яшчэ на тэрыторыю Украіны адправілі камплекты вучнёўскай мэблі, шафы для дакументаў і халадзільнікі. Рашэнне аб аказанні дапамогі, а таксама яе аб'ёме і пераліку вырабаў замацавана ў пастанове Савета Міністраў, якая выйшла ў канцы красавіка. Забеспячэннем водпуску і афармленнем матэрыяльных каштоўнасцяў займаліся Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства прамысловасці, Беларускі дзяржаўны канцэрн харчовай прамысловасці, Гродзенскі і Віцебскі аблвыканкамы. Як растлумачылі ва ўрадзе, суправаджэннем і дастаўкай гуманітарнай дапамогі займаецца МНС пры садзейнічанні Міністэрства замежных спраў.

У мінулым годзе гуманітарная дапамога размяркоўвалася сярод грамадзян, якія знаходзяцца ў зоне канфлікту па абодва бакі лініі размежавання на Данбасе. Тады беларускі бок дзейнічаў сумесна з Міжнародным камітэтам Чырвонага Крыжа.

Дар'я КАСКО.